КАРЭЛІЦКАЯ РАЁННАЯ ГАЗЕТА

Полымя

Газета выдаецца з 13 лютага 1944 года

№ 49 (6423) СУБОТА, 29 чэрвеня 1996 года Кошт падпіскі на ІІ-ое паўгоддзе -- 39 тысяч рублёў.

Пасяджэнне райвыканкама

26 чэрвеня адбылося чарговае пасяджэнне раённага выканаўчага камітэта, на якім разгледжаны пытанні сацыяльна-эканамічнага жыцця раёна.

Галоўным на парадку дня пасяджэння было пытанне: «Аб рабоце Мірскага пасялковага выканаўчага камітэта па забеспячэнню сацыяльнай абароны насельніцтва», з дакладам па якім выступіў загадчык аддзела сацыяльнай абароны райвыканкама В. Р. Калтуноў. Больш падрабязна аб гэтым мы раскажам у адным з наступных нумароў газеты, а сёння зазначым, што работа пасялковага выканаўчага камітэта ў гэтым напрамку прызнана здавальняючай.

Разгледжаны таксама пытанні «Аб зацвярджэнні комплекснай праграмы дзеянняў па ахове правоў дзіцяці на 1995—2000 гады», «Аб зацвярджэнні спіса народных засядацеляў суда Карэліцкага раёна», па якіх прыняты адпаведныя рашэнні.

Прыняты таксама рашэнні аб пастанoўцы на ўлік раённай арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў, Карэліцкай паляўніча-рыбалоўнай гаспадаркі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў, раённай арганізацыі Беларускай Ветэрынарнай Асацыяцыі.

Па пытанню аб увядзенні падатку на ўтрыманне прыгараднага пасажырскага аўтатранспарту прынята рашэнне вынесці яго на разгляд сесіі раённага Савета дэпутатаў.

Раённы выканаўчы камітэт вынес таксама рашэнні аб прыняцці на раённы бюджэт дзіцячага сада племзавода «Карэлічы», аб выдзяленні зямельных участкаў пад праектаванне аб'екта і будаўніцтва асабістых жылых дамоў грамадзян.

На сваім пасяджэнні раённы выканаўчы камітэт выключыў з рэестра дзяржаўнай рэгістрацыі Рэспублікі Беларусь вытворча-камерцыйную фірму «ТОМІКС» — таварыства з абмежаванай адказнасцю.

Разледжаны некаторыя іншыя пытанні.

На прыём да дэпутата?

Калі ласка!

У сувязі са зваротам дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па Карэліцкай акрузе N 132 Аляксея Аляксандравіча Яновіча, а таксама заявамі Вольгі Мікалаеўны Мароз і Ліліі Сцяпанаўны Дзіваковай, раённы выканаўчы камітэт сваім распараджэннем зацвердзіў памочнікамі-сакратарамі дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь А. А. Яновіча Вольгу Мікалаеўну Мароз, якая жыве ў гарадскім пасёлку Карэлічы па вуліцы Савецкай, дом 17, кватэра 16 і Лілію Сцяпанаўну Дзівакову, якая жыве ў гарадскім пасёлку Мір, вуліца Танкістаў, дом 64, кватэра 7.

Паважаныя выбаршчыкі! Па ўсіх пытаннях асабістага характару, а таксама сацыяльнага і эканамічнага жыцця звяртайцеся да памочнікаў-сакратароў, якія арганізуюць улік вашых запытаў, вусных заяў і прапаноў і даводзяць іх да ведама дэпутата.

З мэтай ажыццяўлення іх А. А. Яновіч мяркуе арганізаваць у ліпені бягучага года прыём грамадзян у памяшканні краязнаўчага музея ў Карэлічах і Мірскім пасялковым Савеце.

Тэлефанаваць да памочніка-сакратара дэпутата В. М. Мароз можна па тэлефоне: 2-11-75 (музей), а да Л. С. Дзіваковай па тэлефонах: 23-4-02 (з 8 да 12 гадзін), або 23-2-96 (з 13 да 17 гадзін).

Да ведама дэпутатаў раённага Савета і жыхароў раёна.

Прэзідыум раённага Савета дэпутатаў па ведамляе аб тым, што **чарговая, сёмая сесія раённага Савета дэпутатаў 22-га склікання назначана на 25 ліпеня 1996 года і будзе праходзіць у зале пасяджэнняў Дома Саветаў.**

ПАЧАТАК РАБОТЫ СЕСІІ Ў 10.00 ГАДЗІН.

На разгляд сесіі выносіцца наступны парадак дня:

1. Справаздача аддзела ўнутраных спраў райвыканкама аб стане работы па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю на тэрыторыі раёна.

2. Паведамленне дэпутата раённага Савета ад Малажухавіцкай выбарчай акругі N 16 Мыслівца І. І. аб выкананні дэпутацкіх абавязкаў.

3. Аб ходзе выканання рашэння раённага Савета дэпутатаў ад 17.09.93 N 130 «Аб стане і мерах па павышэнню ролі сацыяльных фактараў эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці ва ўмовах пераходу да рыначных адносін».

Прэзідыум просіць усіх дэпутатаў і жыхароў раёна свае заўвагі і прапановы да сесіі паведамляць па тэлефоне: ***2-14-34.***

ІДЗЕ "зялёнае жніво"



З культурных зямель і няўдобіц

Без стрэсаў і вялікіх узрушэнняў прайшла мінулая зімоўка ў грамадскай жывёлагадоўлі калгаса «Лукі». Адносна спакойнае жыццё абумовіла нядрэнная кармавая база. А якое становішча ў галіне кормавытворчасці ў бягучым годзе? Аб гэтым гутарка нашага карэспандэнта з загадчыкам першага вытворчага ўчастка.

— У нашым распараджэнні, -- расказвае Міхаіл Міхайлавіч Гурын, -- 1090 гектараў ворнай зямлі. Маем таксама 360 гектараў сенажацяў і 400 гектараў пашы. Займаемся вырошчваннем зерневых культур, якімі занята ў бягучым годзе 600 гектараў. Пасеялі 280 гектараў ячменю, 100 гектараў гароху ў чыстым відзе, 70 гектараў кукурузы, 45 гектараў кармавых караняплодаў і іншыя сельскагаспадарчыя культуры.

Віды на ўраджай нядрэнныя і маем надзею, што год будзе спрыяльным для корманарыхтоўкі. Аднак, каб падстрахавацца і больш рацыянальна выкарыстаць сельгасугоддзі, сёлета на няўдобіцах і іншых землях пасеялі каля 200 гектараў аднагадовых, а таксама сумесяў гароху з аўсом.

Пастаянную ўвагу надаём кармавым караняплодам, якія своечасова прапалолі, унеслі на кожны гектар у выглядзе падкормкі па 1,5 цэнтнера мачавіны, зрабілі паўторнае рыхленне.

Займаемся шматгадовымі травамі, якімі занята ва ўчастку 30 гектараў, столькі ж маем канюшыны і 40 гектараў люцэрны. Дарэчы, канюшына, якая прызначана на насенне, падкошана 15—17 мая і гэта дазволіла закласці ў ёмістасць каля 300 тон высакаякаснага сенажу.

Масавую нарыхтоўку кармоў для грамадскай жывёлы пачалі з касьбы натуральных сенажацяў. Каля 100 гектараў іх убрана на сена. З кожнага гектара гэтых угоддзяў атрымліваем каля 3 тон гатовага сена.

Сёння трэба назваць нашых старанных механізатараў, якія заняты назапашваннем кармоў. Сярод іх машыністы комплексаў Е-301 і Е-302 Мікалай Іванавіч Кіпра і Віктар Пятровіч Садоўскі. Кожную пагодлівую хвіліну выкарыстоўваюць для сушэння сена механізатары Аляксей Лукіч Сак і Віктар Віктаравіч Тананка, а на заключным этапе з рулонным прэсам шчыруе Уладзімір Уладзіміравіч Валчок. Добрых слоў заслугоўваюць і трактарысты Васілій Лукіч Сак і Віктар Пятровіч Крапіўніцкі.

Калі гаварыць шчыра, то ўсе сельскагаспадарчыя работы даводзіцца выконваць у напружанай абстаноўцы. На ўвесь участак усяго толькі 8 працаздольных. Але на выручку ў гарачую пару прыходзяць такія старанныя працаўніцы, як Вера Лукінічна Забенька, якая аднолькава сумленна і ўмела працуе на сеялцы і іншых работах, не з горшых сейбітаў і Ганна Уладзіміраўна Тананка, не адмаўляецца ні ад якой работы Соф'я Уладзіміраўна Крапіўніцкая.

Пасільную дапамогу аказваюць і пенсіянеры. Сярод іх Зінаіда Сцяпанаўна Марушкевіч, Антаніна Давыдаўна Кураш і іншыя. Думаю, што сумеснымі намаганнямі мы дасягнем пастаўленай мэты, як бы складана гэта ні было.

Гутарыў С. ЛУКА.

НА ЗДЫМКУ: *злева направа машыніст комплекса Е-302 Віктар Пятровіч Садоўскі, загадчык першага вытворчага ўчастка Міхаіл Міхайлавіч Гурын і машыніст комплекса Е-301 Мікалай Іванавіч Кіпра падчас кароткага перапынку.*

Фота Л. ЛЕЙКІ.

Пасевам — старанны догляд

Днямі ў раёне праводзіўся традыцыйны агляд пасеваў, у якім удзельнічалі старшыні гаспадарак, галоўныя аграномы, аграномы-аграхімікі і насеннязнаўцы, загадчыкі вытворчых участкаў, спецыялісты шэрагу раённых службаў і арганізацый аграпрамысловага комплексу.

Працавалі па трох маршрутах. Затым у Луцкім сельскім Доме культуры былі падведзены вынікі ўбачанага.

У цэлым кіраўнікі маршрутаў — аграном упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама А. А. Тарлоўская, начальнік раённай станцыі аховы раслін У. Л. Хіневіч і аграном гэтай жа станцыі П. М. Бычко — здавальняюча ацанілі дзейнасць многіх спецыялістаў і кіраўнікоў вытворчых падраздзяленняў гаспадарак. Вядома, былі ўскрыты пэўныя хібы і ўпушчэнні.

Гэтыя інфармацыі падагульніў галоўны аграном упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама М. І. Бязмен (па выніках агляду будзе прынята адпаведнае рашэнне).

Затым са сваёй ацэнкай дзейнасці па стварэнню належнай кармавой базы выступіў галоўны заатэхнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама І. С. Барыскін.

Аб хібах у арганізацыі нарыхтоўкі кармоў гаварыў начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання райвыканкама В. Д. Мітлашкоў.

Вынікі ўсёй гэтай размовы падвёў старшыня раённага выканаўчага камітэта Я. Э. Альфяровіч.

І. ДОРАШ.

ХОД НАРЫХТОЎКІ КАРМОЎ

Даныя райсельгасхарча на 28.06.96 г.

Назва гаспадарак	Убрана у % да плана	Нарыхтавана (у %) сена	Нарыхтавана (у %) сенажу	Цэнт. карм. адз. на ўмоўную галаву жывёлы
"Маяк"	73	17	47,3	4,8
імя Чарняхоўскага	75	30	54,4	3,5
імя Царука	79	19,4	53,0	3,3
імя Калініна	88	22,2	44,1	2,3
"Ленінкі шлях"	52	26,1	67,6	5,1
імя Гастэлы	68	13,0	34,3	2,4
"Сцяг перамогі"	87	33,1	35,0	3,0
"Лукі"	75	18,7	55,3	4,4
імя Жалезняковіча	53	21,0	38,0	2,1
"Савецкая Беларусь"	81	16,1	15,0	1,7
"Мірскі"	75	30,3	50,0	4,9
"Варонча"	80	26,2	87,4	10,0
"Карэлічы"	86	24,3	92,8	6,1
Усяго па раёну:	**73**	**22,4**	**50,6**	**3,7**

Да 200 -- годдзя Яна ЧАЧОТА

ТАЛЕНТ НАРОДЖАНЫ ПЕСНЯЙ

11 гадзін раніцы... Да цэнтральнай плошчы гарпасёлка з'язджаюцца прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі, грамадскасць рэспублікі, каб разам з землякамі паэта на яго радзіме -- Карэліччыне ўшанаваць памяць славутага беларуска-польскага паэта і фалькларыста Яна Чачота. І хоць надвор'е не спрыяла святкаванню, але людзей сабралася шмат. Бо Карэліччына -- радзіма і Ул. Сыракомлі, і В. Каратынскага, і Б. Кіта і многіх іншых.



Слова прадастаўляецца загадчыку аддзела райвыканкама па кіраванню гарадскім пасёлкам Карэлічы І. М. Александровічу: "...Ад імя жыхароў Карэліч рады вітаць вас на свяце. Сёняшні дзень прынёс да нас адраджэнчаскую хвалю-- ушанавання памяці незабыўнага фалькларыста і паэта Яна Чачота, аддаць даніну памяці яго 200-гадоваму юбілею. Сёння мы адкрываем бюст Чачота ў нас на карэліцкай зямлі. "

Права адкрыцця бюста Яну Чачоту прадастаўляецца нашаму земляку, народнаму пісьменніку Беларусі І. А. Брылю і старшыні райвыканкама Я. Э. Альфяровічу.

Пра час, беларускасць , пра тое, што Ян Чачот стаяў ля вытокаў пашырэння ўжытку беларускай мовы і папулярызацыі песень народа і гаварылі ўдзельнікі ўрачыстасці.

Мітынг адкрывае старэйшы з прысутных, народны пісьменнік Беларусі І. А. Брыль: " На працягу апошніх дзесяцігоддзяў Акадэмія навук Беларусі выдала багатую бібліятэку нашага фальклору, што складае больш за сорак аб'ёмістых тамоў. Трэба сказаць, што на працягу многіх вякоў Беларусь была паняволена, прыгнечана, пазбаўлена мовы, сваіх песень і нават сваёй гісторыі . Аднак народ спяваў песні і калыханкі, смяяўся над анекдотамі і чэрпаў мудрасць з прыказак і прымавак. Рэдка ў якога народа ёсць яшчэ такая скарбніца народнай творчасці. І яна расла, дзесьці з паловы XIX стагоддзя і да нашага часу. Беларускай народнай творчасці аддавалі належную ўвагу фалькларысты Расіі, Польшчы і нашы айчынныя. Можна назваць такія імёны: Раманаў, Сержпутоўскі, Федароўскі і бліжэй да нашага часу Максім Гарэцкі, Рыгор Шырма, Ігнат Цітовіч... Сам юбіляр не быў вучоным - фалькларыстам, ён быў паэтам, чалавекам польскай культуры, але беларускага паходжання, як і яго сардэчны пажыццёвы сябра Адам Міцкевіч... Але пісаў ён не толькі




на польскай мове, але і на мове сваіх продкаў,-- беларускай. У гэтым праяўлялася яго сыноўняя любоў да роднай зямлі, народа. Таксама, як і Адам Міцкевіч , які з высокай міжнароднай трыбуны, калі ён быў лектарам у Парыжы, гаварыў пра беларускую мову, што яна "найчысцейшая з усіх славянскіх моў і заслугоўвае большай пашаны, чым яна мела ў той час." Гадоў дваццаць пяць таму назад мне ўдалося наведаць вясковыя могілкі, пастаяць ля надмагільнага помніка паэту ў Ротніцы... Думалася пра лёс гэтага сціплага і высакароднага па душы, але беднага з самога маленства... Думалася, чаго заслугоўвае гэты чалавек, літаратар, гэты рэвалюцыянер ад трох народаў, душа якога дзялілася на народы--польскі, беларускі і літоўскі (песні якога ён таксама збіраў і перакладаў на польскую мову). Праўда, літоўцы культурныя і магіла Чачота добра дагледжана. Там прыгожы помнік з эпітафіяй іхняга агульнага з А. Міцкевічам сябра-- паэта Адынца. Аднак зразумейце і маю радасць і маё хваляванне, што нарэшце гістарычная праўда перамагае. На радзіме дарагога нам земляка сёння адкрыты першы яму помнік і народ беларускі святкуе яго юбілей..."

Да мікрафона падыходзіць пісьменніца В. М. Іпатава: " Я стаяла і думала, што шмат прайшло народу па Зямлі і што засталося ад многіх з іх... Ад некаторых народаў засталіся толькі знакі на стэлах, засталіся творы мастацтва, тое, што чалавек зрабіў застаецца. Я думаю пра лёс беларускага народа, лёс беларускага слова, што застанецца ад яго? А гэта , па сутнасці, залежыць ад кожнага. Я звяртаюся да маладых жанчын, што тут ёсць, бо калі яны не зразумеюць, што ад іх, маці, залежыць беларускасць у сям'і, то яна сапраўды знікне...Творчая інтэлігенцыя робіць высілкі, а часам і вялікія намаганні для таго, каб затрымаць, спыніць гэты працэс, павярнуць яго туды, куды ідуць усе народы, да атаясамлівання сябе са сваёй зямлёй, да ўзвышэння сваёй культуры. Часам мы, беларускія інтэлігенты, не ўсё робім дзеля свайго народа. Мы вярталі храмы, калі нас лаялі за гэта. У гэтыя храмы сёння прыходзяць другія людзі і зноў сварацца на нас за тое, што мы не так робім, што мы вяртаем сімволіку, нашы гербы, што хочам іх замацаваць за нашым народам

Але мы жывём, мы творым, робім гэта. Робім для народа, бо гэта адзінае, што нас жывіць , што дае нам сілы, з чаго мабыць мы не звернем ніколі, якія б буры і навальніцы над краем і зямлёй не ішлі, мы будзем гэта рабіць ... Так, як рабіў гэта Ян Чачот. Ён і не думаў пра тое, што будуць усталёўвацца яму помнікі, што вуліцы будуць называцца яго імем, што яго імя не згіне ў бездані часу. Ён проста рабіў, што мог для свайго народа, і хачу заклікаць, каб кожны штосьці зрабіў для свайго народа, для Беларусі.

На адкрыцці бюста Я. Чачоту прысутнічаў і скульптар А. С. Шатэрнік, які



зрабіў бюст нашага земляка." Вялікі гонар для майстра -- прысутнічаць на адкрыцці сваёй працы . Хоць дзень і пахмурны, але цёплы, як і нашыя пачуцці, стаўленне і памяць пра гэтага чалавека,-гаварыў Аляксандр Сяргеевіч. -- Цяжка прамаўляць пасля майстроў слова, бо мая праца не патрабуе слоў--людзі глядзяць. Разам з тым, калі думаеш пра Яна Чачота, пра ягоны подзвіг, пра багацце культуры і людзей, то міжволі і словы ўсплываюць . Ехаўшы сюды, склалася чатырохрадкоўе:

Я помнік Чачоту на плошчы паставіў,
Дакорліва вочы на нас пазіраюць,
Як мову шануем, як песні спяваем,
Як сябра Міцкевіча тут спачывае.

Ён шчыра дзякаваў кіраўніцтву раёна, гарпасёлка і аддзелу культуры мясцовага райвыканкама за магчымасць увасаблення ідэі.

Прыгожыя краявіды ваколіц натхнялі і натхняюць паэтаў. Яскравы прыклад таму--мноства аматараў паэзіі і мясцовых паэтаў. Адзін з іх І. І. Вярбіцкі -- удзельнік літаб'яднання "Рэчанька" пры райгазеце "Полымя". Ён і прачытаў свой верш:

Мой цёзка Ян, не напрасткі
Вяртаўся доўга ты дадому,
Далёка дзесьці два вякі
Цябе трымала моцна стома.

Але сляды не знішчыў час,
Пад гукі чыстай прыгажосці
Усё ж вярнуўся ты да нас
І семянінам стаў, і госцем.

Цары знікалі, рубяжы
Не раз мяняліся пад крыкі,
А ты ўсё гэта пераўжыў
Сваёй паэзіяй вялікай.

Цяпер ты будзеш благаслаўлён
У родным краі назаўсёды,
Няхай тваіх баладаў звон
Спрыяе вернаму народу.

"Дзень добры" я прыйшоў сказаць,
Жыццё твой плён не расцярушыць.
Хай песні шчырыя гучаць
На незалежнай Беларусі.

Музычнае аздабленне ўрачыстасці прыпаднесла вакальная група дзіцячай музычнай школы.

Да бюста Яну Чачоту ўскладваюцца кветкі.

Далей свята працягвалася на радзіме паэта, у вёсцы Малюшычы, якія хоць " малы слядок" славутага паэта і фалькларыста, але хаваюць. Саша Гацкі, які трапнымі вершаванымі радкамі сустрэў гасцей рэспубліканскага свята на малюшыцкай зямлі, заверыў прысутных, што таксама стане паэтам, як і знакаміты зямляк.

Хлебам-соллю сустракаюць гасцей свята ля школы. Яго прымае народны пісьменнік Іван Антонавіч Брыль. Ля галоўнага ўваходу





на будынку школы прымацавана мемарыяльная дошка, што засведчыла гады жыцця і смерці беларуска- польскага паэта -земляка Я. Чачота. Бо вуліца, якая раней іменавалася Школьнай зараз будзе мець гонар насіць імя Яна Чачота. Імя славутага земляка жадае насіць таксама і мясцовая школа, таму не быў нечаканасцю прагляд тэматычнай выставы ў школе. Госці і вяскоўцы з гонарам прайшліся па вуліцы . Фурманкі, якія мясцовыя майстры мабыць знарок выкавалі да свята ўяўна пераносілі нас у тагачасны перыяд гісторыі. Праўда, вуліцы раней не асфальтаваліся Але кожны перыяд уносіць хоць нейкую карэкціроўку ў подых свайго часу.

Паважліва і гасцінна сустракаюць на стадыёне ўдзельнікаў урачыстасці маладыя дзяўчаты ў белым. Яны як сімвал чысціні і кахання... Пасля прывітальнага слова старшыні Малюшыцкага сельскага Савета А. К. Брэгана, каравай прымае старшыня Карэліцкага райвыканкама Я. Э. Альфяровіч.

На мясцовым стадыёне, дзе і праходзілі асноўныя дзеі тэатралізаванага свята "Талент народжаны песняй", усё " гаварыла" аб тым часе. Асаблівую адметнасць гэтаму перыяду прыдавалі выразныя народныя строі ва ўбранні галоўнай пляцоўкі і сцэны, і нацыянальным адзенні.

Была наладжана шырокая выстава вырабаў народных майстроў, дзе выстаўляліся разьба па дрэве, карункапляценне, жывапіс і малюнкі. Шмат работ прывезлі і з Мірскага МПТВ-234.

У 1855 годзе знакаміты Уладзіслаў Сыракомля ў адным са сваіх артыкулаў пісаў, што яму вядомы усяго два беларускія пісьменнікі , якія свядома пачалі пісаць на мове свайго народа. Адным з іх быў незабыўнай памяці Ян Чачот , другі-- Вінцэнт Дунін -Марцінкевіч...

Ва ўмовах паланізатарскай палітыкі Рэчы Паспалітай у XIX стагоддзі, калі агульнапрызнанай і дзяржаўнай была польская мова, -- рабіць гэта было нялёгка. Таму і сабраліся тут аматары яго творчасці, каб ушанаваць памяць і ў нейкім разе дакрануцца да яго неўміручай творчай спадчыны, якая грунтуецца на фальклоры. Дзякуючы плённай фалькларыстычнай яго дзейнасці з 1837 па 1846 гады ён занатоўвае і выдае 6 кніг "Вясковых песень з -над Нёмана і Дзвіны", куды ўвайшлі 1000 беларускіх народных песень.

Тым часам на сцэне вядучыя згадваюць пра яго жыццё і творчасць . Паўстаюць героі яго балады "Мышанка", дзе з сыноўняў замілаванасцю родным краем ён піша:

О мілы ўспамін! Дарагая Мышанка!
Зноў снішся ты ў барве заранак.
Найпершая ў свеце мая ты каханка,
Мільгнуў тут жыцця маіго ранак.

Адсюль з баранавіцкіх ваколіц хлапчуком Ян Чачот адпраўляецца на вучобу ў павятовы гарадок Наваградак, дзе шчыра і на ўсё жыццё пасябраваў са сваім аднакласнікам, будучым вялікім паэтам з сусветным імем Адамам Міцкевічам...

Пазней іх агульны сябра па Віленскаму універсітэту Ігнат Дамейка ўспамінаў: "Два нашы студэнты з Наваградскай школы добра ведалі беларускі люд, палюбілі іх песні, яны разам хадзілі на кірмашы, царкоўныя ўрачыстасці, бывалі на сялянскіх вяселлях, дажынках... У тыя школьныя гады ўбогая страха і народныя песні распалілі ў абодвых паэтычны агонь, які потым ярка разгарэўся. Адам хутка ўзнёсся да высокай сферы цудоўных твораў. Ян жа навекі застаўся верны народнай паэзіі..."

Удала ўпісаўся ў сцэнарную пастаноўку фальклорны гурт Запольскага Дома культуры з народнымі прыпеўкамі...

Сваё прызванне бачыў Ян Чачот у збіранні і вывучэнні беларускіх народных песень. Звонка гучаць яны сёння па гэтых ваколіцах... Значэнне творчасці Яна Чачота цяжка ацаніць. Гэта досвітак беларускай літаратуры, яе першыя крокі, прадвесце нацыянальнага Адраджэння. Запаленае яго святло на досвітку беларускай літаратуры ніколі не згасне, народжанае народнай песняй у папярэдніх пакаленнях.

(Працяг на 4-й стар.)

ПРОГРАММА ТЕЛЕПЕРЕДАЧ

ПОНЕДЕЛЬНИК, 1 июля

БТ

18.50, 0.10 Новости.
19.05 «Крок».
19.35 Супергол.
20.05 Премьера цикла. «Познай себя».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.45 Спортивный телекурьер.
22.05 Фильмотека. Руфина Нифонтова в худ. фильме «День, когда исполняется 30 лет».
23.30 Международный семинар по авторским правам актеров и исполнителей.
0.25 «Турнир мастеров».

ОРТ

5.00 Телеутро.
8.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
8.15, 17.20 «Секрет тропиканки». Сериал.
9.05 «Что? Где? Когда?»
10.30 Человек и закон.
11.10 В эфире телерадиокомпания «Мир».
11.50 Худ. фильм «Все будет хорошо».
13.40 Мультфильм.
14.20 «Рыцарь Отважное Сердце». Мультсериал.
14.45 Марафон-15.
15.00 Звездный час.
15.40 «Элен и ребята».
16.05 Джэм.
16.30 Семь дней спорта.
18.10 Час пик.
18.35 Тайна жизни и смерти Максима Горького в сериале «Под знаком Скорпиона». 1-я серия.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
19.55 Реклама.
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 Президентские выборы-96.
20.55 «Под знаком Скорпиона». 2-я серия.
22.05 Тема.
22.50 Новости.
23.00 «Все, что возьму я с собой...». Юрий Шевчук и группа «ДДТ».

Канал «РОССИЯ»

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.00 Вести.
7.20 Деловая Россия.
8.05 Время деловых людей.
8.15 «К-2» представляет: Ю. Никулин, А. Зацепин, С. Светличная и Н. Гребешкова в программе «Сюжет».
9.10 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
13.30 Мультсериал.
14.00 Иванов, Петров, Сидоров и другие.
14.40 Деловая Россия.
15.05 Россия в лицах.
15.20 Там-там новости.
15.35 Волшебный чемодан.
15.50 Мультфильм.
16.20 Зависит от тебя.
16.35 «Девочка из завтра». Сериал для подростков.
17.05 Голосуй и победишь!
17.20 Прогулки для аппетита.
17.30 L-клуб.
18.15 Момент истины.
19.35 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
20.25 «От форте до пьяно».
20.55 Погода на завтра.
21.00 «Разыскивается особо опасный преступник». Худ. фильм.
22.45 Дневник фестиваля «Нижегородская ярмарка».
23.15 Музыка всех поколений.

ВТОРНИК, 2 июля

БТ

8.00, 15.00, 18.50, 0.15 Новости.
15.15 «Флиппер». Телесериал для детей.
15.40 Композиторы Беларуси.
16.45 Творческое объединение «Телефильм». «После Победы». Док. фильм.
17.30 Музыкальный антракт.
17.40 Уроки Н. Новожиловой.
18.15 Будьте здоровы.
18.25 Экономикст.
18.35 «Трижды один».
19.05 «Рэкс—верный друг полицейского». Телесериал. 5-я серия.
20.05 Вертикаль.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.05 «Звезды» на экране. Л. Касаткина в худ. фильме «Помни имя свое».
23.50 «Турнир мастеров».

ОРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 22.50 Новости.
8.15, 17.20 «Секрет тропиканки».
11.50 Фильм Евгения Цымбала «Повесть непогашенной луны».
13.25 Любовь с первого взгляда.
14.20 «Рыцарь Отважное Сердце».
14.45 Кварьете «Веселая квампания».
14.55 Мультигроллия.
15.10 Волшебный мир, или Синема.
15.40 «Элен и ребята».
16.05 ...До шестнадцати и старше.
16.30 Семь дней спорта.
18.10 Час пик.
18.45 «Под знаком Скорпиона». 3-я серия.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
19.55 Реклама.
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 «Под знаком Скорпиона». 4-я серия.
22.00 «До и после». Ведущий В. Молчанов.
23.05 «Тот самый Мюнхаузен». 1-я и 2-я серии.

Канал «РОССИЯ»

7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 22.00, 22.50 Вести.
9.00, 19.35 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
9.55 Клип-антракт.
13.30 Мультсериал.
14.00 Иванов, Петров, Сидоров и другие.
15.05 Россия в лицах.
15.20 Там-там новости.
15.35 Веселый ветер.
15.50 Месяцеслов.
16.20 Мультфильм.
16.35 Зависит от тебя.
16.50 «Девочка из завтра». Сериал для подростков.
17.20 Тележурнал «Здоровье».
17.30 Своя игра.
18.00 Чрезвычайный канал.
18.25 «Ничего, кроме...».
18.40 «Темная» для Е. Сидорова.
20.30 Джентльмен-шоу.
21.00 Погода на завтра.
21.05 «Кавказская пленница, или Новые приключения Шурика». Худ. фильм.
22.35 Дневник фестиваля «Нижегородская ярмарка».
23.05 «Основной инстинкт». Худ. фильм.

СРЕДА, 3 июля

БТ

10.10 Видимо-невидимо.
11.10 Короткометражный фильм.
12.00 «После Победы». Док. фильм.
13.25 Белорусская литература 20-30-х годов.
13.55 История Беларуси в XVII—XIX веках.
14.25 Русская литература.
15.00 Новости.
15.15 «Флиппер». Телесериал.
15.40 «Рельсовая война. Три удара». Док. фильм.
16.05 К Дню освобождения Беларуси. «Полет». Телеспектакль.
17.05 «На добрый лад».
17.20 Многоголосие.
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 Телеочерк, посвященный памяти маршала Г. К. Жукова.
18.25 Экономикст.
18.35 «Трижды один». Музыкальная передача MTV.
18.50 Новости.
19.00 Концертный сезон.
19.30 Футбол. Чемпионат Беларуси.
20.20 «Кто это?» Телеигра.
20.25 Телеочерк.
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.05 «Через кладбище». Худ. фильм.
23.25 К Дню освобождения Беларуси. Песни военных лет.

ОРТ

7.00 «Тропиканка» раскрывает свои секреты. Три новые серии.
8.15 Новости.
8.30 «Тропиканка» раскрывает свои секреты (продолжение).
11.25 «Варшавская мелодия». Фильм-спектакль.
13.25 Поет София Ротару.
14.00 Новости.
14.20 Ростропович, Покровский. «Хованщина» в Большом.
15.20 Футбол на родине футбола. Евро-96.
16.15 Парижские тайны Эльдара Рязанова».
17.00 Новости.
17.20 Фильм В. Хотиненко «Зеркало для героя». 1-я и 2-я серии.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Новости.
20.15 Программа передач.
20.30 Фильм-спектакль.
21.55 Реклама.
22.00 Время.
22.45 Приключенческий фильм «Экипаж».
23.00 Новости.
23.10 «Экипаж» (продолжение).
0.00 Новости.
0.10 «Экипаж» (продолжение).

Канал «РОССИЯ»

7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Вести.
9.10 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
10.20 Доброе утро.
11.15 Мультфильм.
11.30 Деловой автограф.
11.40, 13.40 «Дом, который построил Свифт». Худ. фильм.
12.55 Магазин недвижимости.
14.25 Астрология любви.
14.55 Сказки нашего детства.
15.50 Экс эль мьюзик.
16.20 Поют драм. актеры.
16.45 Мультфильм.
16.55 Футбол. Чемпионат России.
19.35 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
20.25 Сам себе режиссер.
20.55 Прогноз погоды.
21.00 На концерте ансамбля «Русская песня».
21.50 Дневник фестиваля «Нижегородская ярмарка».
22.00, 22.30, 23.00, 23.30, 24.00, 0.30, 3.00, 4.00 Зеркало.
22.10 «Гений. Худ. фильм. 1-я и 2-я серии.

ЧЕТВЕРГ, 4 июля

БТ

10.50 «Зорная ростань».
13.25 Белорусская литература.
13.55 История Беларуси в XIX — XX веках.
14.25 Русская литература.
15.00 Новости.
15.15 «Флиппер». Телесериал.
15.40 Мультфильм.
15.50 Куда пойти учиться?
16.30 Марсово поле.
17.00 Кредо.
17.20 Уроки Н. Новожиловой.
17.50 Музыкальный антракт.
18.00 Белорусский дом.
18.25 Экономикст.
18.35 «Трижды один».
18.50 Новости.
19.05 «Рэкс— верный друг полицейского». Телесериал. 6-я серия.
20.05 «Крок».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.05 «Королева Марго». Худ. фильм. 9-я серия.
23.05 «Крок».

ОРТ

8.00 Новости.
8.15 «Секрет тропиканки».
9.05 Парижские тайны Э. Рязанова».
9.45 Клуб путешественников.
10.30 Мультфильм.
10.40 Смак.
11.00 Новости.
11.10 В эфире телерадиокомпания «Мир».
11.50 «Русь изначальная». Худ. фильм. 1-я серия.
13.15 Мультфильм.
13.25 Любовь с первого взгляда.
14.00 Новости.
14.20 «Рыцарь Отважное Сердце».
14.45 Лего-го!
15.10 Тин-Тоник.
15.40 «Элен и ребята».
16.05 Рок-урок.
17.00 Новости.
17.20 «Секрет тропиканки».
18.10 Час пик.
18.35 Лотто «Миллион».
19.00 Один на один.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 И. Скляр и А. Панкратов-Черный в муз. комедии «Мы из джаза».
22.25 «Обоз».
23.15 Новости.

Канал «РОССИЯ»

7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.10 Вести.
9.00 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
9.55 Клип-антракт.
10.20 «Преступление со многими неизвестными». Худ. фильм. 1-я серия.
11.20 Ретро-шлягер.
11.50 Док. фильм.
12.15 Деловой автограф.
12.25 Док. фильм.
12.55 Магазин недвижимости.
13.20 Фольклор.
13.30 Мультсериал.
14.00 Иванов, Петров, Сидоров и другие».
14.40 Деловая Россия.
15.05 Россия в лицах.
15.20 Там-там новости.
15.50 Месяцеслов.
16.20, 23.25 Музыка всех поколений.
16.35 Зависит от тебя.
16.50 «Девочка из завтра». Сериал для подростков.
17.20 Экспо-видео.
17.30 Раз в неделю.
18.00 Лидер-прогноз.
18.25 Ничего, кроме...
18.40 «Темная для Е. Ткаченко.
19.35 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
20.30 Эх, дороги!
21.05 «Чемпион». Худ. фильм.

ПЯТНИЦА, 5 июля

БТ

15.00 Новости.
15.10 «Флиппер». Телесериал для детей.
15.35 Сельчане.
16.05 Параграф.
16.35 Музыкальный антракт.
16.45 «Крок».
17.15 Мастерская.
17.35 Контрасты. Правовая программа.
18.05 Олимпийский силуэт.
18.25 Экономикст.
18.35 «Трижды один».
18.50 Новости.
19.00 «Рэкс — верный друг полицейского». Телесериал. 7-я серия.
19.55 «Международный курьер».
20.25 Приглашает «Декорум».
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.55 Музыкальный антракт.
22.05 «Королева Марго». Худ. фильм. 10-я серия.
23.05 «12, или На ночь глядя».
23.25 Акколада. Музыкальная программа.
24.00 Новости.
0.15 Мотоспорт.

ОРТ

8.00 Новости.
8.15 «Секрет тропиканки».
11.50 «Русь Изначальная». 2-я серия.
12.55 Мультфильм.
14.00 Новости.
14.20 «Рыцарь Отважное Сердце».
14.45 Фильм-сказка.
16.05 «Элен и ребята».
16.30 Семь дней спорта.
17.00 Новости.
17.20 «Секрет тропиканки».
18.15 Человек и закон.
18.45 Поле чудес.
19.45 Спокойной ночи, малыши!
19.55 Реклама.
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 «Детективное агентство «Лунный свет». Сериал.
21.45 Взгляд.
22.30 Новости.
22.40 «Верный Руслан». Худ. фильм.

Канал «РОССИЯ»

7.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 22.00, 23.25 Вести.
9.00 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
9.55 Клип-антракт.
10.20 Торговый дом.
10.35 «Преступление со многими неизвестными». Худ. фильм. 2-я серия.
13.30 Мультсериал.
14.00 Иванов, Петров, Сидоров и другие.
14.00 Деловая Россия.
15.05 Россия в лицах.
15.20 Там-там новости.
15.35 Золотой ключик.
15.50 Мультфильм.
16.20 Музыка на десерт.
16.35 Зависит от тебя.
16.50 «Девочка из завтра». Сериал для подростков.
17.20 «Кроха» о детских товарах.
17.30 Подиум.
18.00 Вертикаль.
18.25 Анонимные собеседники.
19.35 «Санта-Барбара». Худ. фильм.
20.30 Маски-шоу.
21.00 Погода на завтра.
21.05 Э. Тейлор в фильме «Последний раз, когда я видела Париж».
23.10 Дневник фестиваля «Нижегородская ярмарка».
23.40 Музыка всех поколений.
23.55 Ночное рандеву. Ренат Ибрагимов.

СУББОТА, 6 июля

БТ

10.00 «Ералаш».
10.20 Белорусский меридиан.
10.50 «В ожидании Годо». Телеспектакль. Часть 1-я.
12.25 Многоголосие.
12.55 «В ожидании Годо». Телеспектакль. Часть 2-я.
14.00 Коллаж.
14.30 Музыкальная программа MTV.
15.15 Гости в дом.
15.45 Мультфильм.
16.15 Голоса прошлого.
17.05 «Зорная ростань».
18.35 Галерея.
19.10 «Семь криков в океане». Худ. фильм.
20.40 Колыбельная.
21.00 Новости.
21.45 «Принц из Нью-Йорка». Худ. фильм (США).
23.25 Видимо-невидимо.

ОРТ

7.00 «Ералаш».
7.35 Фильм «Мальва».
9.00 Новости.
9.10 Слово пастыря. Митрополит Кирилл.
9.30 Не зевай!
10.00 Утренняя почта.
10.35 Смак.
10.50 «Сокровища Государственного Исторического музея». Фильм 3-й.
11.20 Фильм «Друг мой Колька!»
12.50 «Театр + TV». Н. Гундарева.
13.35 Автомобиль и я.
14.00 Новости.
14.20 Америка с М. Таратутой.
14.50 В мире животных.
15.55 Футбол. Чемпионат России.
18.00 «Семь невест ефрейтора Збруева".
19.45 Спокойной ночи, малыши!
19.55 Реклама.
20.00 Время.
20.40 Программа передач.
20.45 «Детективное агентство»Лунный свет».
21.45 Брэйн-ринг.
22.40 Дни.
23.20 Мелодрама "Грозовой перевал".

Канал «РОССИЯ»

7.00, 13.00, 19.00, 22.00, 23.25 Вести.
7.20 Мультфильм.
8.00 «Элли и Джулс». Телесериал.
8.25, 11.50 Клип-антракт.
8.35 Ваш партнер.
8.45 По вашим письмам.
9.15 Парламентская неделя.
10.00 Вести в одиннадцать.
10.15 Путешествие «Инвайт».
10.30 Доброе утро!
11.25 21 кабинет.
12.00 Проще простого.
12.30 «Заметки о театре».
13.20 Фольклорный фестиваль.
13.35 Де факто.
14.05 «Океан». Худ. фильм. 3-я серия.
14.55 Спорт-пари.
15.25 Лицо с обложки.
15.40 Ток-шоу.
16.20 «Две стрелы». Худ. фильм.
17.50 Мультфильм.
18.00 Совершенно секретно.
19.35 Субботний вечер с Алисой Фрейндлих.
20.55 Погода на завтра.
21.00 Программа «А».
22.05 Сделано в Голливуде. «Во всем виноват посыльный». Худ. фильм.

Да 200 -- годдзя Яна ЧАЧОТА

ТАЛЕНТ НАРОДЖАНЫ ПЕСНЯЙ



(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

На сцэну запрашаюцца госці свята... У сваіх прамовах кожны шчыра выказвае сваё стаўленне да паэта. Я. Э. Альфяровіч зазначыў, што "... імя Яна Чачота называецца ў першым радзе сярод тых, хто стаяў ля вытокаў беларускага нацыянальнага Адраджэння. На радзіме Яна Чачота добра ведаюць яго творы, ён прысвяціў іх свайму народу... На Карэліччыне ўшаноўваюць памяць вядомага паэта і фалькларыста. 15 чэрвеня адбыліся трэція карэліцкія навуковыя чытанні, у гарпасёлку Карэлічы ўстаноўлены бюст, адна з вуліц у вёсцы Малюшычы, мясцовая сярэдняя і Карэліцкая музычная школы будуць насіць імя Яна Чачота..."



Слова прадастаўляецца начальніку ўпраўлення устаноў культуры Міністэрства культуры РБ, старшыні аргкамітэта многіх фестываляў Тадэвушу Іванавічу Стружэцкаму: "...У гэтыя дні праходзяць дзесяткі святаў, фестываляў і імпрэз, але мы лічым, што свята, прысвечанае 200-ым угодкам Яна Чачота, з'яўляецца найбольш важным, бо гэты чалавек зрабіў многае для таго, каб мы з вамі ўсведамлялі сябе беларусамі. Выдатна, што кіраўніцтва райвыканкама, грамадскасць выйшлі з ініцыятывай і Міністэрства культуры, і Саюз беларускіх пісьменнікаў, іншыя грамадскія арганізацыі падтрымалі ідэю правядзення ў рэспубліцы мерапрыемстваў, прысвечаных 200 -ым угодкам Яна Чачота..."

У другі раз у гэты ж дзень слова прадастаўляецца І. А. Брылю, але гаварыць пра землякоў і родную зямлю ніколі не наскучыць. " Мне пашчасціла нарадзіцца між двумя Міцкевічамі, - - гаворыць Іван Антонавіч, - - Адам Міцкевіч -- навагрудскі і Кастусь Міцкевіч - - стаўбцоўскі. Прыгадваецца старое выказванне: " У Бога няма вялікага і малога, ёсць крывое і простае". Ян Чачот па сваёй сіле і таленту-гэта не тое, што Адам Міцкевіч. Аднак, ён любіў Беларусь, беларускае слова, фальклор не менш, чым яго сябар А. Міцкевіч, які дарэчы, многаму вучыўся ў старэйшага -- Яна Чачота. І гэты след любові, вучобы генія ў значна меншага па таленту паэта відаць у творчачсці Міцкевіча. Які вынес, узяўшы як эстафету, ад Чачота гэтае полымя, гэты вогнік любві да Беларусі і панёс яго на увесь свет. Трэба памятаць, што зробленае вялікім Міцкевічам, зроблена





з дапамогай яго сардэчнага, пажыццёвага сябра...

Карэліччыну я люблю з самых малых дзён. Калісьці тут ездзіў са сваім маладзейшым сябрам -- выдатным беларускім пісьменнікам Уладзімірам Караткевічам. Ён тады нагадваў такое выказванне: " На Беларусі Бог жыве ", а я яму падказаў, калі ён жыве на Беларусі, наогул, то бадай самая лепшая яго кватэра на Карэліччыне..."

В. М. Іпатава-- таксама зямлячка. Таму яна шчыра далучаецца да слоў І. А. Брыля аб гаючасці роднай зямлі і моцы, якая перадаецца ад побыту тут. "Успамінаю аб тым, што на мяжы стагоддзяў вучоныя ўсё больш гавораць пра своеасаблівую ауру над нашай Зямлёй, якая складаецца са светлых думак і пачуццяў чалавецтва , якое разбураюць толькі злоба і нянавісць . Ёсць гэтая ахоўная аура над кожным народам, яна складаецца з думак святых, подзвігаў пісьменнікаў і духоўнасці народа. Астролагі сцвярджаюць, што замак у Міры-- гэта сімвал адраджэння Беларусі. Зараз ён аднаўляецца , дабаўляюцца вежы-- гэта вялікая праца кіраўніцтва раёна. Дык калі верыць прадказанням, тут на Карэліччыне--сэрца беларускага Адраджэння..." На заканчэнне яна прачытала верш, што прысвечаны замку ў Міры.

Чырвонай ніткай праз прамовы выступоўцаў праходзіла настальгія па шанаванню духоўных набыткаў народа. Аб гэтым жа гаварыў і доктар мастацтвазнаўства, прафесар Анатоль Вікенцьевіч Сабалеўскі: "...Тут з гэтай зямлі пачалося многае. Ян Чачот быў з першых, хто пачаў збіраць беларускую народную творчасць. Ён паклікаў за сабой у дарогу вялікую плеяду фалькларыстаў. Дзякуючы яму, мы маем самы багаты фальклор у славянскім свеце. Ян Чачот сваёй паэзіяй наклікаў у дарогу наступнікаў -- В. Дуніна-Марцінкевіча, Фр. Багушэвіча, Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча і іншых. Закладзеныя традыцыі падхопліваліся і перадаваліся..."

Першы сакратар пасольства Рэспублікі Польшча ў Беларусі Марэк Галкоўскі ў сваім выступленні адзначыў, што Чачот, безумоўна, сын свайго часу. Прыгадаў, што "...Чачот быў сасланы ў Сібір не за тое, што спяваў беларускія песні, а за сваю дзяржаўную і грамадзянскую дзейнасць. Таксама, як і Міцкевіч. Варта памятаць: Міцкевіч, Чачот і другія рамантыкі далі палякам агромную магчымасць жыць праз 200 гадоў без сваёй дзяржавы. І мы лічым, што рамантызм мае вялікае месца ў польскай літаратуры. Дзякуй яму за тое, што даў нам знаёмасць з фальклорам, і пачуццё дзяржаўнасці і адказнасці за яе..."

Прасачыць лёс, перыяды жыцця і творчасці прысутныя маглі і па рэліквіях часу, фотаздымках, фотакопіях, у цэлым па фотавыставе, якую сюды прывезлі супрацоўнікі раённага музея "Зямля і людзі".

Не абыйшлося свята без гістарычнага маскараду, выступленняў калектываў мастацкай самадзейнасці з Ліды, Баранавіч, Слуцка і іншых месц рэспублікі, не вядучы гаворку ўжо аб фальклорных калектывах нашага раёна, што выступаюць даволі высокапрафесійна.

З дапамогай ансамбля "Кантраданс" з Баранавічаў, што створаны ў 1992 годзе з настаўнікаў дзіцячай музычнай школы № 3, усе мелі магчымасць акунуцца ў старадаўні час, праслухаць старажытныя танцы XVI стагоддзя з Полацкага спытка.

Сцэна не пуставала ні на хвіліну. Добра, што свята не ператварылася ў аднабокае відовішча на сцэне, на "масавікоў-забаўляльнікаў". Людзі разыйшліся і паўсюдна ва ўсіх куточках стадыёна ішлі святочныя забавы, народ весяліўся. Гэта--падцвярджэнне моцы нашага народа, што ўмее ён весяліцца і жыць годна і сумленна нават тады, калі жывецца цяжка.

Падведзены таксама вынікі конкурсу, аб'яўленага рэдакцыяй райгазеты "Полымя" і аддзелам культуры мясцовага райвыканкама на лепшы паэтычны твор, прысвечаны гэтаму юбілею. Пераможцамі сталі -- Іван Вярбіцкі з Карэліч і бібліятэкар Луцкай сельскай бібліятэкі Алена Матусевіч.

Гэта быў першы дзень рэспубліканскага святкавання 200-ых угодкаў Яна Чачота ў нас на карэліцкай зямлі. На наступны дзень працягвалася яно ў Мінску, у Доме літаратара.

Пётр ЖЭБРАК.

НА ЗДЫМКАХ: *імгненні рэспубліканскага свята, прысвечанага 200-м угодкам Яна Чачота на карэліцкай зямлі.*

Фота Л. ЛЕЙКІ.

Калектыў МП «Радуга» глыбока смуткуе з выпадку трагічнай смерці камерцыйнага дырэктара **ОРСІКА Анатолія Іванавіча** і выказвае шчырае спачуванне яго **родным і блізкім.**

Калектыў МП «Радуга» выказвае глыбокае спачуванне **ОРСІК Ларысе Уладзіміраўне** і сыну **Сашы** з выпадку напаткаўшага іх гора — трагічнай смерці **мужа і бацькі.**

Жыхары 1-га і 2-га пад'ездаў дома N 3 па вул. 1 Мая смуткуюць з выпадку смерці **ЧАЧОТКА Аляксандра Ільіча** і выказваюць шчырае спачуванне **родным і блізкім** памёршага.

Жыхары вул. Паштовай в.Турэц глыбока смуткуюць з выпадку трагічнай гібелі суседа **ОРСІКА Анатолія Іванавіча** і выказваюць спачуванне **родным і блізкім.**

Нам. рэдактара С. А. ЛУКА

"П О Л Ы М Я"

КАРЭЛІЦКАЯ раённая газета

Выдаецца ў г. п. Карэлічы Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: раённы Савет дэпутатаў, раённы выканаўчы камітэт, калектыў рэдакцыі.

Газета выходзіць два разы на тыдзень -- сераду і суботу.

Аб'ём газеты--1 друкаваны аркуш.

Індэкс выдання 64033.

НАШ АДРАС: 231430, г. п. Карэлічы, пл. 17 Верасня, 7

ТЭЛЕФОНЫ: рэдактара--2-21-65, намесніка рэдактара, аддзела сацыяльна-палітычнага жыцця і адказнага сакратара --2-17-02, бухгалтэрыі --2-19-02, раённага радыё --2-10-02

Газета набрана і звярстана на камп'ютарна-выдавецкім комплексе Карэліцкай райгазеты "Полымя".

Тыраж 1159.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў несуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў.

За змест аб'яў і іншых рэкламных матэрыялаў рэдакцыя не адказвае. Усе даведкі -- у рэкламадаўцаў.

Газета надрукавана афсетным спосабам. Лідская друкарня Упраўлення культуры і друку Гродзенскага аблвыканкама. 231300, г. Ліда, вул. Ленінская, 23

Над нумарам працавалі: камп'ютарны дызайн і вёрстка П. І. Жэбрака, аператар камп'ютарнага набору Л. М. Лука, карэктар Л. В. Бабанская.